# КУЛЬТ *ЭТНАСУ* І ДЭКАНСТРУКЦЫЯ *НАЦЫІ* (ДВА ДАСЯГНЕННІ АКУДОВІЧА)

**Пётра Рудкоўскі***

**Abstract**

The paper is the analysis of the well-known Belarusian philosopher Valiantsin Akudovich's ideas, mainly on the ground of his book *The Code of the Absence. On the Foundations of Belarusian Mentality*. The author of the paper argues that Akudovich paradoxically represents at once «mystical nationalism» (thereby approaching the non-militant ultra-nationalism) and deconstructionist reconsideration of the traditional nationalist dogmas. The author critically evaluates both features of Akudovich's discourse, highlighting that his nationalism finds itself in dangerous affinity with tribalism, while his reinterpretation of Belarusian history proves to be internally inconsistent and unable to survive empirical verification.

**Keywords**: Belarusian identity, nationalism, deconstruction, apophatism, nothing.

## 1. Preliminaria

Канец XX і пачатак XXI ст. стаў асабліва плодны ў плане інтэлектуальных дыскусій вакол праблемы беларускай ідэнтычнасці. Розныя дыскурсы, якія сфармаваліся ў прэцэсе гэтых дыскусіяў, можна было б – крыху ўмоўна – падзяліць на «правіцу», «лявіцу» і «цэнтар». Да *правых* адносіліся б у гэтым выпадку дыскурсы, у якіх *нацыя* разам з кананічнаю атрыбутыкай (мова, культура, гісторыя) утварае аксіялагічны цэнтар. Народ-нацыя, нацыянальная тоеснасць і нацыянальная культура ўтвараюць у гэткіх дыскурсах «канчатковы слоўнік» у сэнсе Р. Рорці. У якасці экзэмпліфікацыі гэтага дыскурсу можна назваць моцную нацыяналістычную праграму Леаніда Лыча[1], хрысціянска-кансерватыўную версію беларускай ідэі Зянона Пазьняка[2], а таксама нацыянальную гісторыю Міколы Ермаловіча[3].

Да *левых* можна аднесці дыскурсы, пазначаныя *дэканструкцыйным* падыходам да пытанняў нацыі і нацыянальнае тоеснасці. Нацыянальная тоеснасць трактуецца тут зазвычай як анахранізм, а ў рознага роду «нацыянальных праектах» выкрываецца крыпта-таталітарная сутнасць. За-

---

* Пётра Рудкоўскі – магістар філязофіі (Ягелёнскі ўнівэрсытэт, г. Кракаў), магістар багаслоўя (Папская акадэмія навук, г. Кракаў), выкладчык ЭГУ (логіка, метады навуковага даследаваньня); e-mail: piatruk@gazeta.pl.

мест «тоеснасці» (адзіночны лік) дэканструкцыяністы аддаюць перавагу «тоеснасцям» (множны лік) і акцэнтуюць шматлікасць спосабаў аўтаідэнтыфікацыі без якога-кольвечы ўніфікацыйнага прынцыпу. Нярэдка ў гэтых дыскурсах з'яўляецца ідэя «грамадзянскай» або «космапалітычнай» тоеснасці як больш прэферавальных альтэрнатыў для нацыянальнай тоеснасці. Ролзаўскі лібералізм Янава Палескага[4], ідэя постнацыянальнай эпохі Рыгора Мінянкова[5], космапалітызм Андрэя Екадумава[6] – вось магчымыя экземпляры «левых», дэканструкцыяніс цкіх дыскурсаў.

*Цэнтрысцкія* дыскурсы ў маім разуменні больш-менш адпавядаюць таму, што Анджэй Валіцкі і Яэль Тамір называюць *ліберальным нацыяналізмам*[7]. Дыскурсы гэтага тыпу, прасоўваючы ідэю нацыянальнай дзяржавы як аптымальны прынцып арганізацыі грамадскага жыцця, падкрэсліваюць ролю кананічных ліберальных каштоўнасцяў, такіх як асабістая свабода, плюралізм і першынство індывіду перад калектывам. Адбываецца тут якбы марыяж нацыяналізму і лібералізму. Такі падыход характэрны асяроддзям *ARCHE* і *Нашай Нівы* і, магчыма, *Праўніка* і *Палітычнай сферы*.

Прадстаўніком якога дыскурсу з'яўляецца Валянцін Акудовіч? Вось жа тут справа няпростая. Існуюць прычыны, дзеля якіх погляды гэтага філосафа можна трактаваць як адну з версій нацыяналізму, прычым крайняга (хоць не ваяўнічага), таго, што можна было б акрэсліць наймем *містычнага нацыяналізму*. Увадначассе Акудовіч парадаксальным чынам явіцца як выбітны дэканструкцыяніст, разбуральнік традыцыйных догмаў наконт беларускай нацыі. У далейшай частцы артыкула паспрабую раскрыць і ацаніць гэту парадаксальную спецыфіку Акудовічавай беларусалогіі.

## 2. Гульня ў «мяне няма». Вынік: апафатычны нацыянальны дыскурс

У кнізе *Мяне няма...*[8] Акудовіч аналізуе (калі аналізам можна назваць свабодныя эсэістычныя разважанні) тры эпохі, якія цягам гісторыі змянялі адна адну: эпоху Татэму, Міфу і Тэксту. На яго думку, зараз мы знаходзімся на этапе заняпаду апошняга апірышча сэнсу – Тэксту. Ідзе да завяршэння культура тэксту, а разам з гэтым развальваецца апошні гарант сэнсу – Бог.

Але не толькі ідэя Бога падлягае дэструкцыі. Змярканне эпохі Тэксту азначае таксама змярканне эпохі Чалавека. Чалавек явіцца цяпер як феномен без сутнасці. Яго жыццё пазбаўлена сэнсу. Адзінае яго прызначэнне палягае ў тым, каб «адбыць быццё». Як утрапёна ні пераконвалі б прапаведнікі-аптымісты, «я – гэта семдзесят кілё костак, тлушчу, цягліц і вадкасьці чырвонага колеру, – піша філосаф і дадае: Час чалавека сканчаецца – у самых розных сэнсах. І ў сэнсе часу, дарэчы, таксама».

І вось, у гэтай наскрозь нігілістычнай візіі змяркання эпохі Тэксту з'яўляецца, быццам светлейца ў тунэлі, аблічча якогасьці боства. Але гэта ні ў якім разе не трансцэндэнтнае боства, вя-

домае нам з вялікіх рэлігій – хрысціянства, юдаізму і ісламу. Гэта іманентны і лакальны бог – Этнас, які явіцца Акудовічу як фрагментарнае быццё: *Архіпелаг Беларусь*.

У іншай сваёй кнізе *Дыялогі з Богам*[9] Акудовіч намагаецца зынтэрпрэтаваць ідэю свайго этнічнага бога пры дапамозе улюбёнай катэгорыі – *нябыт*:

> «Пакуль іншыя народы прырасталі здабыткамі, мы мацаваліся стратамі. І цяпер мы багатыя на "няма", як ніхто. У нас няма гісторыі, няма мовы, няма свабоды, няма ладу, і, магчыма, зноў ня будзе сваёй дзяржавы. Ды і пра саміх беларусаў хто ўпэўнена скажа: ці то яны ёсьць, ці то іх няма?.. »

Вырваны з кантэксту, гэты фрагмент можа стварыць уражанне, што маем тут дачыненне з нейкай хваравітай тэндэнцыяй да самапрыніжэння альбо мазахістычнымі лямантацыямі, вельмі характарыстычнымі для беларускай народніцкай паэзіі. Калі ж прачытаем гэты фрагмент у кантэксце шэрагу іншых выказванняў Акудовіча, то, магчыма, заўважым, што катэгорыя «няма» выконвае тут якуюсь спецыфічную, на першы погляд незаўважную, функцыю. Давайце звернем увагу яшчэ на адзін фрагмент, узяты гэтым разам з кнігі *Код адсутнасці*[10]:

> «...для мяне тая Беларусь, якую мы цяпер маем, выяўляецца не руінамі лакальных дэфармацый апошніх некалькіх соцен гадоў, а сакральным вынікам усёй тысячагодавай (як мінімум) гісторыі гэтай прасторы. А ўсё сакральнае варта шанаваць такім, якое яно ёсць. Бо той, хто не шануе сакральнае, абірае сабе радзімай прафаннае».

Беларусь, такім чынам, – гэта адначасова багацце і галеча, *sacrum* і *profanum*, боства і нябыт. Члены гэтых трох кан'юнкцый не ўзаемавыключаюцца, а наадварот, узаемадапаўняюцца і ўзаемна адно другое акрэсліваюць. Акрэсліванне боскасці пры дапамозе нябыту характэрна *апафатычнаму багаслоўю*, вось чаму Акудовічаву канцэпцыю нацыянальнай ідэі я назваў *апафатычным нацыянальным дыскурсам*[11].

Этнас, гэты лакальны і іманентны бог, дае Акудовічу адчуванне цяпла і ўтульнасці. Асабліва палкай любоўю пакахаў ён адзін з атрыбутаў свайго бога – мову. «Я ашалеў, – прызнаецца ў *Кодзе адсутнасці*. – Я сноўдаўся самнамбулай, як закаханы. Зрэшты, чаму "як"? Я і быў закаханы ў "матчыну" мову. ... Я бяз стомы прамаўляў розныя словы ды сказы (і ўголас, і сам сабе), што нават пачалі пабольваць цяглíцы твару».

Палымяная любоў, дакладней, *каханне* да беларускай мовы, ускладанне надзеі на беларускасць (прычым этнічную беларускасць) як на адзіную магчымасць утульнасці, а таксама ўзнясенне беларускага этнасу ў ранг боскасці – усё гэта сведчыць аб «праваасці» Акудовічавага дыскурсу і чыніць яго ў гэтым нават больш радыкальным за Пазьняка альбо Ермаловіча (для

гэтых апошніх беларускі этнас усё ж не з'яўляецца богам, а іхні нацыяналізм ўраўнаважваецца – хоць і мінімальна – хрысціянскім універсалізмам).

На гэты «ультра-правы» слой Акудовічавага дыскурсу накладваецца, як было ўжо прыкмечана, «левы» – дэканструктарскі – слой. Што канкрэтна Акудовіч дэканструюе?

## 3. Гульня ў дэканструкцыю. Вынік: алагічны нацыянальны дыскурс

***1***. Па-першае, Акудовіч дэканструюе ролю рэлігіі і Царквы (або цэркваў) у паўставанні беларускае нацыі:

> «Мы выспелі як Нацыя без непасрэднага ўдзелу Царквы. Калі на абшарах нашай краіны адбывалася адзяржаўленне Рэлігіі (ВКЛ, Рэч Паспалітая), Нацыя яшчэ не выспела, калі нацыя выспела, ужо не было ні сваёй Дзяржавы, ні сваёй Царквы. ... Калі б не быційная, а рэлігійная культура была асновай беларускай Нацыі, дык ад нас ужо даўно і шматкоў не засталося б».[12]

А крыху пазней, каб «прыпячатаць» арэлігійны характар беларускага народу і нацыі, Акудовіч прыкмячае:

> «Для мяне няма больш трагічнага відовішча, чым укленчаны беларус, які моліць Бога, каб той збярог яго нацыю».

***2.*** Акудовіч выконвае таксама своеасаблівае *Entwertung* адносна Вялікага Княства Літоўскага. На яго думку, ВКЛ не толькі не было беларускай дзяржавай, але нават іграла адмоўную ролю ў паўставанні беларускай нацыі:

> «Калі б ВКЛ – пры ўсіх магчымых гістарычных трансфармацыях – не страціла дзяржаўнасці да нашага часу, дык напэўна, сёння мы б не мелі знаку ні сучаснай беларускай нацыі, ні беларускай мовы...»

***3.*** А вось XVIII і XIX стагоддзі, якія беларускія нацыяналісты з горыччу называюць перыядам татальнай элімінацыі ўсякіх прыкметаў беларускасці з публічнага жыцця, з'яўляюцца для Акудовіча перыядам амаль самым істотным з пункту гледжання паўставання нацыі:

> «Як да нацыянальнага выспявання (і выспявання нацыянальнай мовы), дык асабіста мне падаецца куды больш істотным не перыяд ВКЛ з яго "залатым" XVI стагоддзем, а вось гэтая пара "татальнага мораку" XVIII–XIX ст. Больш за тое, я схільны лічыць, што не ў часы ВКЛ, а менавіта ў гэтую "нічыйную пару" і сфармаваліся беларусы як этнас – маючы на ўвазе ўласна беларускі этнас».

Расейскую Імперыю, якая Пазьняку явіцца амаль як дэманічная сіла, Акудовіч называе «калыскай беларускай нацыі» і перасцерагае перад атаесамленнем Імперыі як такой з расейскім нацыяналізмам.

Імперыя сталася калыскай нацыі ў тым сэнсе, што «нацыянальнае выспяванне беларусаў адбывалася ў ценю змагання (праз русіфікацыю) Расейскай дзяржавы з апалячваннем нашага краю. Але паколькі што “апалячванне”, што “русіфікацыя” (што іхні двубой) пераважна выражаліся ў дыскурсах улады, дык нішто не замінала беларускаму этнасу натуральным чынам фармавацца ў пазбаўленых каналаў хоць якой улады вёсцы».[13]

***4.*** Дэканструкцыі падлягае таксама апазіцыя паміж Беларускай Народнай Рэспублікай (БНР) і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай (БССР), якая культывуецца многімі (хоць не ўсімі і не безагаворачна) беларускімі нацыяналістамі, дзе першае явіцца са знакам плюс, а другое – са знакам мінус:

> «...я прапаную мінімалізаваць “адвечную” (і жорсткую) апазіцыю БНР – БССР. Бо калі ацэньваць сітуацыю ў вялікім вымеры паўставання Дзяржавы, то БНР і БССР пачынаюць выглядаць не як дзве смяротна варожыя паміж сабой падзеі, а як адна і тая самая, толькі ў розных варыянтах палітычнай фармалізацыі. Калі заўгодна, дык што ідэалагемна, што ідэалагічна БНР з БССР – блізнюкі».

Галоўным – і, бадай, адзіным – аргументам на падтрымку гэтае тэзы ёсць заўвага, што «і тое, і другое дзяржаўнае ўтварэнне абапіралася на тыя самыя базавыя пастулаты: сацыял-дэмакратыю і нацыяналізм. ... Згадаем дзеля прыкладу хаця б той вядомы факт, што недзе да 1929 года Савецкая Беларусь цалкам разгортвалася ў нацыяналістычнай мадэлі (“беларусізацыя”)».

Прадстаўленыя вышэй цвярджанні Акудовіча сапраўды атакуюць найбольш фундаментальныя догмы беларускіх нацыяналістаў. Ці гэта азначае, што аўтар *Коду адсутнасці* запрапанаваў нам больш распрацаваны, больш рацыянальны і больш узважаны падыход да праблемы беларускай ідэнтычнасці? Думаю, што адказ будзе адмоўны. Давайце прааналізуем Акудовічавы тэзісы.

***Ad 1.*** Што трэба разумець пад выразам «свая Царква»? Тоеснасць межаў Царквы з межамі нацыі? этнічнае групы? дзяржавы? Ясна, што ў хрысціянскую эру такое немагчыма. Хрысціянства заўжды пераступала этнічныя, нацыянальныя і дзяржаўныя межы; гэта тычыцца ўсіх магчымых нацыяў, таму на гэтай падставе немагчыма кантраставаць Беларусь з іншымі грамадскімі суб’ектамі. Думаю, што Акудовіч, гаворачы пра «адсутнасць сваёй Царквы», меў на ўвазе шматканфесійнасць. Але няўжо наяўнасць некалькіх – замест адной – канфесіяў імплікуе цверджанне пра арэлігійны характар якогась народу?

Думаю, што насамперш трэба ачысціць мову ад дзіўных словазлучэнняў тыпу «свая Царква». Прапаную зыходзіць з таго, што *будаванне нацыі з’яўляецца трансфармацыйным працэсам*, дзе самыя розныя элементы – рэлігія, мова, звычаі, грамадскія адносіны, спосабы гаспадарання, законы – усё гэта падлягае такой трансфармацыі, вынікам якой ёсць паўстанне пэўнага ўніверсуму сімвалічнай культуры, званай *нацыянальнай супольнасцю*. Ясна,

што рэлігія сама праз сябе не спародзіць нацыі, гэтаксама як не зробіць гэтага такая інстытуцыя, як Царква або некалькі цэркваў, але яна, рэлігія, з'яўляецца – як у выпадку Беларусі, так і ў выпадку іншых народаў – *кансубстратам* нацыі.

Тэза Акудовіча наконт арэлігійнага характару беларускага народу мае таксама «больш глыбокую» версію. Філосаф паўтарае ўслед за Аляксандрам Меерам, што «застаецца па-за сумневам, што самасцвярджэнне нацыі з гледзішча хрысціянскай рэлігіі ёсць грахом», і абгрунтоўвае гэта пры дапамозе вырванай з кантэксту цытаты са Святога пісання (Пасланне галатам): *Няма ні эліна, ні юдэя.* Ну што ж, давайце ў такім выпадку працягнем чытанне гэтага месца Бібліі: *...няма ані мужчыны і жанчыны*, – і зробім на гэтай падставе выснову, што Бог прадугледзеў якуюсь пачварную генную інжынерыю, якая павінна неадкладна прывесці да з'яўленне бясполага чалавека...

Разумаваньне Акудовіча зьяўляецца нейкім дэмагагічным прыёмам, разлічаным на наіўнага адрасата. Тэза: *Самасцвярджэнне нацыі – грэх з гледзішча хрысціянскай рэлігіі* абгрунтоўваецца тут шляхам звычайнай маніпуляцыі паняткамі: 1) фраза *Няма ні эліна, ні юдэя* вырываецца з кантэксту, 2) словам «элін» і «юдэй» надаецца нацыялагічная трактоўка (хоць сам Акудовіч, напэўна, ведае, што ў I стагоддзі нашай эры людзі не маглі аперыраваць катэгорыяй нацыянальнай супольнасці), 3) самасцвярджэнне нацыі – працэс, які ў значнай ступені абумоўлены гісторыяй – называецца грахом (у хрысціянстве гэты тэрмін адносіцца да добраахвотнага парушэння Божага або царкоўнага прыказання). Самасцвярджэнне нацыі не можа быць грахом як з фармальных прычын (да працэсаў, абумоўленых гісторыяй, не стасуецца прынцып добраахвотнасці), так і з матэрыяльных прычын (няма такога Божага або царкоўнага прыказання, якое хаця б ускосна забараняла самасцвярджэнне нацыі). Грахом з хрысціянскага гледзішча з'яўляюцца ўсякія формы індывідуальнага і калектыўнага эгаізму, а гэта нешта зусім іншае, чым самасцвярджэнне нацыі. Калі, прыкладам, РНЕ проціпастаўляе расейскае нерасейскаму як «вышэйшае» «ніжэйшаму», то тым самым выходзіць за межы хрысціянства (і тут яно можа колькі заўгодна называць сябе «праваслаўным», то бок, хрысціянскім рухам, але з-за сваёй ненавісніцкай праграмы дзеяння аўтаматычна апынаецца за межамі хрысціянства). Але калі гаворка йдзе пра «нацыянальнае самавызначэнне», гэта значыць, пабудову салідарнай, аб'яднанай агульнымі культурнымі сімваламі супольнасці, то якая тут можа быць гаворка пра «грэх»?

Проціпастаўленне хрысціянства ідэі нацыянальнага самавызначэння можа мець дзве прычыны. Першая – гэта адсутнасць элементарных ведаў пра тое, чым ёсць хрысціянства. Другая – блытанне нацыянальнай салідарнасці з племянным адзінствам. Калі пад паняцце нацыянальнай салідарнасці падставім племяннное адзінства, то тады сапраўды напружанне так разуметага нацыяналізму з хрысціянствам будзе навідавоку. Небяспека ператварэння нацыя-

нальнай ідэі ў прымітыўны этнанацыяналізм – як тое мы бачым у выпадку расейскага нацыяналізму, які корміцца нэапаганскім венедызмам, – і ёсць той прычынай, дзеля якой яна (гэта ідэя) павінна быць спалучана з якойсьці ўраўнаважваючай – «універсалізуючай» – сілай. Думаю, такой сілай з'яўляецца перадусім хрысціянства са сваім трайным прынцыпам любові: 1) любоў да сябе (дзе *Я* можа мець калектыўную форму, напр. нацыя); 2) любоў да бліжняга (дзе зноў жа, пад «бліжнім» могуць падразумявацца іншыя народы, нацыі, грамадствы; 3) любоў да Бога, які стаў Чалавекам і жыве ў кожным з людзей.

Беларус, які кленчыць перад Богам і моліцца за сваю нацыю, наўрад ці стане забіваць або хаця б прыніжаць не-беларусаў (дзеля гэтага ён мусіў бы спачатку адвярнуцца і здрадзіць Богу). А вось той беларус, які кленчыць перад беларускім Этнасам і успрымае яго як боства, сапраўды выклікае трывогу. Усякія трыбалісцкія паталогіі кормяцца менавіта этнарэлігіяй, то бок, абагаўленнем уласнага Этнасу.

***Ad 2***. Контрфактычнае разуманне («Калі б ВКЛ... ») скарыстоўваецца тут, відавочна, для таго, каб падкрэсліць, што паміж гістрарычным «ліцвінам» (або «русінам», «рускім») і сучасным «беларусам» (а таксама іх мовамі) няма непасрэднай пераходнасці. У звязку з гэтым нельга з упэўненасцю сказаць, што «ліцвін» (або «русін», «рускі») ператварыўся б у «беларуса» ў выпадку захавання ВКЛ у XIX і XX стагоддзях.

Прапаную ў такім выпадку ўласнае контрфактычнае разуманне. Уявім сабе, што дзесьці ў 2050 годзе Беларусь акупіруюць кітайцы. Стан кітайскай акупацыі трывае, скажам, тры стагоддзі. Вынікам гэтага стану рэчаў становіцца з'яўленне новай народнасці, назавем яе ўмоўна «белакітайскай». А ў 2375 пэўны філосаф, хай ён называецца Іванам Кітабелічам, выступае з крытыкай «беларускага» перыяду, ухваляючы пры гэтым перыяд кітайскай акупацыі, паколькі ў выніку гэтай акупацыі – кажа ён – паўстаў Белакітай. У гэтай сітуацыі напрошваецца наступнае пытанне: а няўжо не было б лепей, калі б Беларусь цягам гэтых трох стагоддзяў развівалася натуральным чынам, без «белакітайскіх» інварыяцый? Тое ж самае можна спытаць і адносна папуляцыі ВКЛ: няўжо не было б лепей, калі б не была б прарвана культурная пераемнасць паміж вялікакняскімі ліцвінамі-русінамі і народам, які паўстаў бы на базе ліцвіна-русінскай культуры?

Тую ж самую думку можна выразіць пры дапамозе рэтраспектыўнага контрфактычнага разумавання (папярэдняе было футураспектыўным). Калі б ВКЛ не страціла дзяржаўнасці, то сёння мы, можа, і не называліся б «беларусамі» і размаўлялі б на трохі іншай мове (назавем яе ўмоўна «снежнабеларускай»), але, перакананы, мелі б намнога мацнейшы і раней сфармаваны нацыянальны імунітэт. Магчыма, балтыйская частка ВКЛ слала б у Вільню бясконцыя патрабаванні даць ім шырокую палітычную аўтаномію, а ў

паўднёвай частцы ВКЛ набіраў бы сілу сур'ёзны сепаратысцкі рух на чале з Юляй Цімашэнкай...

Гэта, канечне ж, трохі жартоўная візія, але яна мае на мэце паказаць, што ў выпадку ацалення ВКЛ былі б, напэўна, свае праблемы і дылемы, але *мы* нікуды не дзеліся б, трансфармаваліся б у нацыю і хіба лепш і хутчэй угрунтаваліся б у сваёй нацыянальнасці.

***Ad 3.*** Ацэнка гэтага тэзісу ускладняецца тым, што тут няясна, ці Акудовіч, разважаючы пра расейскі перыяд, бярэ пад увагу фармаванне беларусаў як *этнічнай групы*, ці ўсё ж як *нацыі*. У адным сказе (гл. цытаванне вышэй) як быццам падразумяваецца фармаванне нацыянальнай супольнасці, у другім жа сказе выразна гаворыцца пра «беларускі этнас».

Што ж, можна пагадзіцца наконт таго, што маргіналізацыя беларусаў у Расейскай Імперыі паспрыяла іх фармаванню як *этнічнае групы*. Але ці спрыяла яна фармаванню беларусаў як *нацыянальнай супольнасці*? (Нагадаю, што з першага сказу цытаванага ў (3) фрагменту вынікае, што так, умовы расейскай акупацыі спрыялі фармаванню беларускай *нацыі*.) Паўставанне нацыі, як было вышэй прыкмечана, ёсць трансфармацыйным працэсам, поспех якога залежыць перадусім ад таго, ці дадзеная этна-культурная група здолее функцыянаваць яе самасвядомы, рэфлексійны і скіраваны на якуюсь мэту *суб'ект*. Суб'ект, які здольны будзе вынайсці такія сімвалы, нарацыі і семіятычныя структуры, якія б утваралі аксіялагічную базу для яго самога як нацыянальнай супольнасці.

Вось жа «пазбаўленая ўсякіх каналаў вёска» ў перыяд «татальнага мораку», якія так усхваляе Акудовіч, – гэта ж пазбаўленая ўсякай суб'ектнасці магма. Няма сумневу, што гэтая вёска выразна адчувала сваю адрознасць-іншасць у стасунку да тых імперыяў, у арбіце якіх яна знаходзілася, аднак жа гэта было адчуванне *інфернальнай* адрознасці. Гэта была адрознасць апрычонай і выключанай з культурнага жыцця *праклятай касты*, без імя і без мовы, касты, якая будзе ідэнтыфікаваць сябе пры дапамозе пазбаўленай якога-кольвечы гістарычнага аднясення назвы «тутэйшыя», а сваю мову будзе сарамліва называць «простай мовай». Царскія ўлады ў сваю чаргу пазнішчалі ўсякія сімвалы і інстытуты, якія маглі б паспрыяць ператварэнню тутэйшых у самасвядомы культурны суб'ект, забараняючы пачаткова ўжывання слоў «Беларусь», «беларускі», касуючы пазней Берасцейкую Вунію, забараняючы беларускую мову ў адукацыйных установах і, канечне ж, імплантуючы тутэйшым пры дапамозе інтэнсіўнай індактрынацыі перакананне, што яны з'яўляюцца інтэгральнай – хоць дэгенераванай – часткай расейкага народу.

Стасаванне да Расейскай Імперыі пяшчотнай метафары «калыска беларускай нацыі» можна апраўдаць хіба што жаданнем здзівіць або заінтрыгаваць чытача, бо ніякай мерытарычнай функцыі яна, як здаецца, не выконвае.

***Ad 4.*** Разважаючы стасунак паміж БНР і БССР трэба перадусім заўважыць, што існавалі прынамсі дзве ідэі Савецкай Беларусі – ідэя Зміцера Жылуновіча з аднаго боку і ідэя Кнорына і Меснякова – з

другога. Паводле Жылуновічавага бачання, Беларусь павінна быць савецкім, але культурна і палітычна аўтаномным утварэннем, у выпадку ж Кнорына і Мяснікова нават гаворкі не магло быць пра якуюсь аўтаномію ці асобнасць Беларусі.[14] Абвяшчэнне паўстання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі 1 студзеня 1919 г. было ўсяго толькі тактычным ходам бальшавікоў, мэтай якіх было «ўціхамірыць» урад БНР, які прабываў тады ў Горадні і пры дапамозе дыпламатычных каналаў выкрываў перад міжнароднай супольнасцю імперыялістычныя замашкі бальшавікоў.[15] Бальшавікі ж у той час не адчувалі сябе настолькі моцнымі, каб ігнараваць дбанне пра сваю рэпутацыю ў свеце. Адсюль і паўстала ідэя БССР, псеўдадзяржавы, дзе нацыянал-камуніст Жылуновіч у ролі прэм'ерміністра быў адно толькі марыянеткай у руках расейскіх бальшавікоў, стратэгічнай мэтай якіх было захаванне імперыялістычнага *status quo*. Фікцыйная дзяржаўка (бо толькі так можна назваць тую пародыю, якую нам зафундавалі бальшавікі 1 студзеня 1919) пад назвай БССР павінна была стаць процівагай для БНР, а пасля аслаблення БНР спачатку выпаласкацца з беларускасці ў запраектаванай Беларуска-Літоўскай Дзяржаве (дзе анічога беларускага і амаль нічога літоўскага не было[16]), а пазней і цалкам раствaрыцца ў расейскай стыхіі. БССР у абедзвюх фазах свайго паўстання (01.01.1919 і 31.07.1920) паўставала пад патранажам праціўнікаў рэальнай аўтаноміі Беларусі. БССР для іх павінна была быць адпаведнікам «Заходняга рэгіёну Савецкай Расеі». Не трэба нават дадаваць, што такая канцэпцыя Беларусі анічога супольнага не мела з канцэпцыяй заснавальнікаў БНР.

Недарэчным падаецца спасылка Акудовіча на «факт», што «і тое, і другое дзяржаўнае ўтварэнне абапіралася на тыя самыя базавыя пастулаты: сацыял-дэмакратыю і нацыяналізм». Па-першае, БССР паўстала тады, калі паміж сацыял-дэмакратыяй і ленінскім камунізмам існаваў хіба што толькі цьмяны ўспамін пра колішняе сяброўства. У 1919 г. і пазней гэта былі дзве розныя і ўзаемна варожыя ідэалогіі. Прызнаючы, што БНР сапраўды была ў значнай ступені сацыял-дэмакратычнай, дадаць трэба, што КПБ(б) старанна фільтравала сацыял-дэмакратызм як ненавісную ерась, санкцыянуючы толькі такія ідэі, якія безагаворачна сумяшчаліся з дактрынай «дыктатуры пралетарыяту».

Па-другое, «беларусізацыя» 1920-х праходзіла не водле «нацыяналістычнай мадэлі», як тое кажа Акудовіч, але ў рамках *часовага* перамір'я паміж бальшавіцкім імперыялізмам і беларускім нацыянальным рэнесансам. Кажучы інакш, у 1920-х гадах паўстаў кволы кампраміс паміж канцэпцыяй Жылуновіча і канцэпцыяй Кнорына з Мясніковым. Але, як ведаем, не пройдзе і дзесяці гадоў, як бальшавіцкі імперыялізм з памножанай энергіяй возьмецца «кампенсоўваць» занадбанні па вынішчэнні беларускай культуры і яе стваральнікаў, і будзе гэта рабіць даволі паспяхова.

Беларусізацыя ў БССР трывала няпоўныя 10 гадоў, а вось перыяд *дэбеларусізацыі* (больш або менш інтэнсіўнай) налічвае добрыя 60

год. Які ў сувязі з гэтым сэнс мае тэза пра ідэйную блізнюковасць БНР і БССР? Гэтае першае праектавалася як нацыянальная дзяржава з дэмакратычным ладам – і фактычна такім было цягам свайго кароткага існавання, а вось БССР сталася рэспублікай максімальна савецка-сацыялістычнай і мінімальна беларускай. Падаецца, што штучнае «асваячанне» гэтых двух утварэнняў з'яўляецца не вельмі ўдалым рытарычным фокусам.

### 4. Гуру свавольнага мыслення

Акудовічава слова моцнае сваёй вобразнасцю і метафарычнасцю, але слабое ў плане лагічнай кагерэнцыі і семантычнай акрэсленасці. Розныя канцэпты ў розных месцах яго дыскурсу маюць ледзь не супрацьлеглае значэнне. Нават той ключ, у якім я запрапанаваў інтэрпрэтаванне Акудовічавых ідэй («два слаі» дыскурсу), не зносіць усіх супярэчнасцяў і складанасцяў ягонага дыскурсу. Пасля прачытання *Коду адсутнасці* так і невядома, ці яго аўтар адстойвае актуальнасць нацыянальнага праекту (бо калі перасцерагаў «свядомых» перад кленчаннем, то рабіў гэта, мабыць, з думкаю пра поспех беларускага адраджэння ў будучыні), ці з'яўляецца радыкальным праціўнікам такога «праектавання» (заявіў жа пра «банкруцтва нацыянальнай ідэі» і заклікаў «не жыць учорашнім днём»). Няясна, якую ролю ў беларускай гісторыі адыгрывае расейскі фактар, бо ў адным месцы Расея прэзентуецца ім як «калыска нацыі», а ў іншым месцы знаходзім тэзу, што «паміж беларусам і расейцам – ментальная бездань». Яднае гэтыя дзве тэзы хіба што толькі ірацыяналізм.

Камунізм і нацыяналізм Акудовіч называе натуральнымі антаганістамі, але заяўляе пры гэтым пра ідэйную аднароднасць камуністычнай БССР і нацыянальна-адраджэнскай БНР. Царква, Вера і Рэлігія – гэта ўвогуле, як вынікае з кнігі *Код адсутнасці*, заклятыя ворагі беларускага адраджэння, і гэта ці не адзіная тэза, якая пададзена адназначна, без контр-тэзы, якая ўваходзіла б з ёй у спрэчнасць. Але тут паўстае спрэчнасць іншага роду, не інтратэкстуальная, а спароджаная стасункам гэтае тэзы да рэчаіснасці, бо, беручы тэзу ўсур'ёз, трэба было б Малады Фронт, БНФ, КХП, БХД прызнаць антыбеларускімі рухамі (па прычыне іх яскравай хрысціянскай афарбоўкі), а такія выданні, як *Наша Вера* або *Царква* абвесціць шкоднымі для беларускага адраджэння. Думаю, такая пастаноўка справы месцілася б на мяжы шызафрэніі.

Славутая фраза «Беларусь – недадуманая нацыя» аўтарства Акудовіча[17] паказвае, што ён імкнецца займаць у пытаннях нацыялогіі наміналістычна-канструктывісцкую пазіцыю, як таго патрабуе сучасная сацыялогія, але амаль уся кніга *Код адсутнасці* з'яўляецца сведчаннем адваротнага – Акудовіч стасуе ў дачыненні да нацыі яскрава натуралісцкія катэгорыі, як «прырода», «сутнасць», сугеруе – у духу эсэнцылісцкага мыслення – наяўнасць «ментальнай бездані» паміж прадстаўнікамі розных нацыяў. З гэтым

эсэнцыялізмам і імператыўнай катэгарычнасцю Акудовіч месціцца на лініі традыцыйнай метафізікі. Нічога дрэннага ў быцці традыцыйным метафізікам няма, але праблема ў тым, што абмяркоўваны філосаф любой цаной спрабуе маскіравацца пад пост-традыцыйнага пост-метафізіка, эксперыментуючы са словамі «нябыт», «няма» і «нішто» і выконваючы іншыя не дужа ўдалыя інтэлектуальныя манеўры. Вынік – сціжма супярэчнасцяў і непаразуменняў.

* * *

Журналісты часам называюць Акудовіча «гуру свабоднага мыслення». На жаль, гэта «свабода» ў яго выпадку азначае часцяком свабоду ад метадалагічных стандартаў і прынцыпаў лагічнага канструявання дыскурсу. Яго канцэптуалізацыя беларускай нацыянальнай ідэі значна адрозніваецца ад канцэптуалізацыі артадаксальных нацыяналістаў, аднак жа нельга сказаць, што яна больш прадуманая і больш унутрана звязная. Яго нацыяналізм знаходзіцца ў небяспечнай блізкасці з культам Этнасу (бо ж сам называе беларускі этнас богам), а рэінтэрпрэтацыя беларускай гісторыі не толькі не касуе цяжкасцяў, наяўных у інтэрпрэтацыі артадаксальных нацыяналістаў, але спараджае масу дадатковых цяжкасцяў, пра якія была гаворка вышэй.

## Заўвагі

1 Гл.: Лыч Л. Нацыяналізм // *Літаратура і мастацтва*. 1997. 14 і 21 лістапада.

2 Гл.: Пазьняк З. *Беларуска-расейская вайна. Belarus is an Eastern Outpost*. Варшава –Нью Ёрк – Вільня, 2005; *Гутаркі з Антонам Шукялойцем*. Варшава: Беларускія ведамасьці. Вільня: Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2003.

3 Гл.: Ермаловіч М. *Па слядах аднаго міфа*. Мн., 1991.

4 Гл.: Полесский Я. Невозможность симбиоза // *Наше мнение* (электронный ресурс) http://www.nmn.org/pub/150805/ligvo.html.

5 Пра спробы прымянення да беларускай рэчаіснасці гэтай ідэі – запазычанай, хутчэй за ўсё, ад Юргена Габермаса – ведаю з вусных выказванняў Р. Мінянкова падчас розных семінараў.

6 Гл.: Екадумов А. Бездомная нация из европейского дома // *ARCHE*. 1999. № 1; Белорусская идентичность: в поисках пятого угла // *Новая Эўропа* (электронный ресурс) http://www.n-europe.eu/content/index.php?p=2814.

7 Гл.: Walicki A. Czy możliwy jest nacjonalizm liberalny? // *Znak*. 1997. № 3; Tamir Y. *Liberal Nationalism*. Princeton University, 1993.

8 Акудовіч В. *Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека*. Менск: БГАКЦ, 1998.

9 Акудовіч В. *Дыялогі з Богам*. Мн.: Логвінаў, 2006.

10 Акудовіч В. *Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці*. Мн.: Логвінаў, 2007.

11 Рудкоўскі П. Містычнае маўчаньне пра Беларусь // *ARCHE*. 2007. № 5.

12 *Код адсутнасці...*

13 Тамсама.

[14] Гл.: Туронак Ю. *Мадэрная гісторыя Беларусі*. Вільня: Інстытут Беларусістыкі, 2006. С. 71; Шарова Н. *Гісторыя Беларусі*. Мн.: ВП «Экаперспектыва», 1999. С. 72–73.
[15] Гл.: Туронак, op. cit., с. 73.
[16] Пра нішчэнне ўсяго беларускага ў гэтай «беларуска-літоўскай» дзяржаве пісаў сучасны сведка А. Грыгор'еў у *Варшавское Слово*; гл.: Туронак, op. cit., с. 74.
[17] Гл.: Акудовіч В. Прэзыдэнт недадуманай нацыі // *ARCHE*. 2004. № 4.